УДК 94(476):331.108

# КАДРАВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ПРАМЫСЛОВАСЦІ НАПЯРЭДАДНІ АДКРЫЦЦЯ МАГІЛЁЎСКАГА ТЭХНАЛАГІЧНАГА ІНСТЫТУТА

**Пушкін І.А.**
**Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання**
**г. Магілёў, Беларусь**

Напрыканцы 1960-х і ў пачатку 1970-х гг. у БССР апераджальнымі тэмпамі развіваліся галіны, якія вызначалі тэхнічны прагрэс, такія, як радыёэлектроніка, прыборабудаванне, машынабудаванне, энергетыка, хімія і іншыя. Падобнае адбывалася і ў харчовай прамысловасці. Адначасова з далейшым развіццём прамысловасці Беларусі фармаваўся кадравы патэнцыял рэспублікі, у складзе якога адбываліся важныя змены, перш за ўсё павялічэнне ўдзельнай вагі інжынерна-тэхнічных работнікаў. У рэспубліцывостра паўстала пытанне аб кадрах, асабліва адчуваўся недахоп высока кваліфікаваных.Неабходна было паскорыць працэс падрыхтоўкі кадраў у рэгіёнах.

Партыйна-савецкае кіраўніцтва БССР не здолела вырашыць праблемы якасці тавараў народнага спажывання, укараненне новых, перадавых тэхнічных распрацовак, ашуканства і крадзяжоў. Аб чым сведчаць афіцыйныя дакументы тых часоў.

У чацвёртым квартале 1969 г. была праведзена праверка якасці выпускаемай прадукцыі на 44 прадпрыемствах Магілёўскай вобласці. На Бабруйскім малочным заводзе было забракавана 23,8% усёй цэльнамалочнай прадукцыі (малако, тварог, марозіва), на Асіповіцкім кансервава-харчовым камбінаце 7,9% кандытарскіх вырабаў (пернікі) і 21,3% кансерваванай гародніны, на Клічаўскім харчовым камбінаце 100% ад наяўных кансерваў садавіны і гародніны, на Быхаўскім хлебазаводзе 6,1% усіх хлеба-булачных вырабаў – 2454 кг (хлеб, батоны, абаранкі), 6,1% хлебабулачных вырабаў на Крычаўскім заводзе, 6,3% хлебабулачных вырабаў на Мсціслаўскім хлебазаводзе, на Чэрыкаўскім гароднінасушыльным заводзе 14,5% плодагароднінных кансерваў, на Бабруйскім плодакансервавым камбінаце 40,7% кансерваў ад агульнай колькасці правераных (салянка), на Глускім хлебазаводзе 14,6% хлебабулачных вырабаў [7, арк. 3–8]. За 1969–1971 гг. выпускам і пастаўкамі не дабраякаснай і не стандартнай прадукцыі прадпрыемствамі абласнога вытворчага аб’яднання малочнай прамысловасці былі нанесены страты дзяржаве ў памеры 412,6 тыс. рублёў.У 1972 г. 35 прадпрыемствам Магілёўскай вобласці забаранялася рэалізацыя 40 відаў прадукцыі [1, арк. 181–183]. Праз тры гады з 49 прадпрыемстваў горада Магілёва толькі 8 прадпрыемстваў выпускалі прадукцыю 64 найменняў, якая была ўганаравана Знакам якасці. Удзельная вага прадукцыі вышэйшай катэгорыі складае толькі 6,4%, 1% другой катэгорыі і 7,8% наогул не атэставанай прадукцыі [3, арк. 8–9].

Стабільна не скарачалася, а павялічвалася колькасць растрат і крадзяжоў, ў выніку чаго народнай гаспадарцы наносіўся вялікі матэрыяльны ўрон. Асабліва шмат было буйных крадзяжоў і злоўжыванняў у спажывецкай кааперацыі БССР. За 1969–1972 г. у Магілёўскай вобласці было зарэгістравана 343 выпадкі буйных растрат і крадзяжоў тавара-матэрыяльных каштоўнасцяў на суму 465,5 тысяч рублёў. Толькі ў 1971 г. выявілі 178 розных адказных асоб, якія ўдзельнічалі ў крадзяжах дзяржаўнай і грамадскай уласнасці, прыцягнулі да адказнасці 146 работнікаў спажыўкааперацыі [1, арк. 194–195]. У 1970–1972 гг. за дапушчаныя злоўжыванні і іншыя недахопы ў працы было вызвалена ад займаных пасадаў 6 старшыняў праўленняў райспажыўсаюзаў, 10 намеснікаў старшыняў праўленняў па гандлі і 12 па кадрах, 12 дырэктараў аптовых баз,

12 дырэктараў райнарыхкантор, 11 галоўных бухгалтараў і 547 матэрыяльна-адказных работнікаў [2, арк. 3]. Факты злоўжыванняў і хабарніцтва былі таксама выкрыты на прадпрыемствах мясной і малочнай прамысловасці. На Бабруйскім малочным заводзе было выкрадзена каштоўнасцяў больш чым на 100 тысяч рублёў [1, арк. 183, 200].

Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва СССР і БССР адной з асноўных прычын такога становішча лічылі сур'ёзныя недахопы ў працы з кадрамі ў прамысловасці, асабліва сярод работнікаў сярэдняга звяна. Там працавала шмат людзей без спецыяльнай падрыхтоўкі, так званыя "практыкі" – спецыялісты, якія не мелі спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасці. 15.12.1971 г. сакратар ЦК КПБ П.Машэраў і старшыня СМ БССР Ц.Кісялёў, звяртаючыся ў ЦК КПСС і СМ СССР наконт адкрыцця ў Магілёве тэхналагічнага інстытута, паведамлялі, што ў харчовай прамысловасці больш 35% работнікаў на інжынерных пасадах – практыкі, штогадовая патрэба ў спецыялістах вышэйшай кваліфікацыі – 600 чал. [6, с. 2–3]

Дарэчы, з-за кадравых праблем у Віцебскай вобласці за 10 месяцаў 1972 г. 40 прамысловых прадпрыемстваў (14,7%) не выканалі план па рэалізацыі прадукцыі, 62 прадпрыемствы па прадукцыйнасці працы. На 45 прамысловых прадпрыемствах прадукцыйнасць працы значна зменшылася ў параўнанні з 1971 г.: Аршанскім мелькамбінаце № 1, Глыбокскім малочна-кансервавым камбінаце, Міёрскім мясакамбінаце і інш. З 22 прадпрыемстваў, абследаваных за ІІІ квартал 1972 г. 10 выпускалі прадукцыю з парушэннем патрабаванняў стандартаў і тэхнічных умоў [5, арк. 16]. Арамя таго, адзначалася нізкая эфектыўнасць навуковых распрацовак у прамысловасці. Напрыклад, на ВА "Хімвалакно" (Магілёў) мелася 4 буйных навукова-даследчых лабараторыі, вопытная ўстаноўка, вопытны цэх, цэхавыя лабараторыі, сучаснае навуковае абсталяванне, магутны парк ЭВМ, значныя грашовыя сродкі. У той жа час там не праводзіліся буйныя навукова-даследчыя працы, не дастаткова плённа выкарыстоўвалася абсталяванне, не вяліся ў шырокім маштабу навуковыя эксперыменты. За год па аб'яднанню ўкаранялася 8–10 заявак, публікацый было ўдвая менш, не рыхтаваліся ўласныя навуковыя кадры [4, арк. 18–19].

Усё гэта і абумовіла неабходнасць стварэння Магілёўскага тэхналагічнага інстытута (цяпер Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання), які павінен быў займацца падрыхтоўкай высока кваліфікаваных кадраў і навуковымі распрацоўкамі.

**Літаратура**


1. Протокол № 8 заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМаг). – Фонд 9. Воп. 149. Спр. 3.
2. Протокол № 33 заседания бюро Могилевского обкома КПБ от 6.04.1973 г. // ДАГАМаг. – Фонд 9. Воп. 151. Спр. 15.
3. Протокол № 39 заседания бюро Могилёвского обкома КПБ от 10.06.1975 г. // ДАГАМАг. – Фонд 9. Воп. 155. Спр. 37.
4. Протокол № 11 заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 19.04.1978 г. // ДАГАМАг. – Фонд 9. Воп. 159. Спр. 109.
5. Протокол XI пленума Витебского ОК КПБ 28–29.11.1972 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Фонд 1-п. Воп. 124. Спр. 8.
6. Пушкин, И.А. Исторический очерк создания и деятельности Могилёвского государственного университета продовольствия / И.А.Пушкин // 35 лет Могилёвскому государственному университету продовольствия / редкол.: В.А.Шаршунов (пред.). – Минск: Изд.центр БГУ, 2009. – С. 2–53.
7. Справка о качестве продукции, проинспектированной на промышленных предприятиях Могилевской области (1969) // ДАГАМаг. – Фонд 9. Воп. 145. Спр. 99.